# ДА ПЫТАННЯ АБ ВАЙСКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ВКЛ

*УДК* ***Поляк Н.А.***

Значнае месца ў ерархіі дзейнасці чалавецтва займае вайсковая дзейнасць. Вайсковая дзейнасць – складанае сацыяльная з’ява. Як частка грамадскага жыцця яна ўяўляе сабой матэрыяльную, прадметна-пачуццявую і мэтазгодную дзейнасць людзей у ваеннай справе.

Змест і формы вайсковай дзейнасці ў гістарычным развіцці грамадства змяняюцца і развіваюцца. Змены грамадства прыводзяць да развіцця, узбагачэння матываў і сэнсаў працы вайскоўца, як суб’екта вайсковай дзейнасці. Прынята вылучаць вайсковы вопыт і сучасную вайсковую дзейнасць.

Вайсковы вопыт, або гістарычны досвед вайсковай дзейнасці вельмі значны аспект у вывучэнні сучаснай вайсковай дзейнасці. Вывучэнню яго у Беларусі надаецца невялікая ўвага. Адсутнасць крыніц, недастатковая папулярнасць тэмы ў савецкія часы, вузка-спецыфічная тэматыка і іншыя прычыны садзейнічалі недасканаламу і эпізадычнаму даследаванню дадзенай праблемы. Айчынныя гісторыкі пакуль што не прадставілі навуковаму асяроддзю грунтоўнай агляднай працы, якая б утрымлівала рэтраспектыўны аналіз і дэманстравала эвалюцыю вайсковай дзейнасці або вайсковай справы на беларускіх землях пачынаючы са з’яўлення першых дзяржаў-княстваў (дружынаў П.Н.) і да сучаснасці. У сучаснай гістарычнай навукі ўвага надаецца ў асноўным гісторыі зброі, амуніцыі, тактыкі вядзення бою, гісторыі дакладных войнаў і ўзброеных канфліктаў, абарончым збудаванням, ваенна-палітычным абставінам дакладных войнай якія разгортваліся на нашых землях або ў якіх прымалі удзел беларускія вайскоўцы. Найбольш змястоўныя даследванні па гісторыі вайсковай справы беларускія навукоўцы прысвяцілі ў асноўным перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Пагэтаму сістэматызацыя і аналіз існуючых ведаў па дадзенай праблематыцы з’яўляецца надзвычай актуальнай і значнай задачай.

Артыкул прысвечаны гісторыі вайсковай дзейнасці перыяду Вялікага Княства Літоўскага таму, што гэта перыяд калі дадзеная сфера дзейнасці грамадства хоць якім небудзь чынам пачала рэгламентавацца заканадаўствам (прывілеі, пастановы і інш.), а таксама таму, што дадзены перыяд дастаткова прадстаўлены ў крыніцах.

ВКЛ да еўрапейскіх традыцый вайсковай справы пачало далучацца дастаткова позна – канец XIVст. Гэты працэс быў звязаны з хрышчэннем Літвы па каталіцкаму ўзору, што абумовіла вестэрнізацыю самых розных бакоў жыцця ў тым ліку і вайсковай дзейнасці.1385 г., калі Ягайла падпісаў акт Крэўскай уніі з Польшчай, быў пакладзены пачатак далучэння ліцвінскай шляхты да рыцарскай культуры і азнаямлення з прынцыпамі вайсковай справы Заходняй Еўропы.

Разглядаючы вайсковую дзейнасць у гістарычнай рэтраспекцыі, трэба адзначыць, што яна ў той ці іншай ступені закранала жыццё ўсяго мужчынскага насельніцтва. Доказам таму могуць служаць спосабы арганізацыі войска ў ВКЛ. Адным з іх была«абарона зямлі» (паспалітае рушанне), а другім – наёмнае войска.

Вядома, што ў 1387 г. Ягайлам быў выдадзены прывілей, у якім гаварылася, што ў выпадку ўварвання непрыяцеля ў землі дзяржавы, усё мужчынскае насельніцтва, якое можа насіць зброю і рыцарства («armigeri») прыцягваюцца да павіннасці па праследаванню ворага – «Пагоні». Пазначалася, што апалчэнцы мусілі ўзбройвацца за свой кошт, а зброя іх не рэгламетавалася і магла быць нават звычайнымі прыладамі працы. Зразумела, што большасць такіх ваяроў складала пешую частку «Пагоні». Аснову ўзброеных сіл складала кавалерыя, якая складалася з асоб валодаўшых зямлёй на рыцарскім праве і вайсковая служба была для іх прафесійным абавязкам.

У XViXVI стст. вайсковая дзейнасць, як павіннасць ліцвінскай шляхты і грамадзянскі абавязак усіх мужчын, паказалі сваю непаўнавртнасць. Тагачасная Еўропа перажывала істотныя змены ў гаспадарчым жыцці. Развіццё прамысловасці патрабавала

ўсё больш сельскагаспадарчай прадукцыі. Шляхта ВКЛ была зацікаўле ў задавальненні такога попыту і вымушана была займацца гаспадарчымі клопатамі, а не ганаровай вайсковай дзейнасцю.

Яшчэ адну прычыну крызісу паспалітага рушання даследчык Бохан Ю.М. бачыць у адсутнасці суровай дысцыпліны ў войску. Так, пры Вітаўце, парушальнікі маглі паплаціцца жыццём. Тым больш, што вельмі істотна змяніўся характар узброеных канфліктаў. І недысцыплінаваныя феадальныя апалчэнні зараз мелі справу з мэтанакіравным націскам лёгкай кавалерыяй, якую мала было разбіць – яе перад гэтым трэба было злавіць у беларускіх лясах [1, с.332].

У XVIст. пачаўся пераход да наёмнага войска, якое не было такім шматлікім, але магло ўступіць у бой без доўгіх збораў. Наймітамі («служэбнымі») былі русіны, татары, чэхі, палякі, сілезцы, рыцары Інфлянскага і Тэўтонскага ордэнаў [7, с. 85]. Пастулова ў войску з’яўляюцца ўраджэнцы беларускіх і украінскіх зямель, якія за вайсковую службу атрымлівалі грашовую аплату. Гісторыя наёмнага войска ў ВКЛ прайшла некалькі этапаў у сваім развіцці і мела шэраг асаблівасцей у сувязі з заключэннем спачатку Крэўскай, а потым і Люблінскай уній.

Такім чынам, з вышэй прыведзенага матэрыялу вынікае, што вайсковая дзейнасць у ВКЛ была прэрыгатывай шляхецкага саслоўя. У Літоўскай Метрыке запісана, што любы ўраднік ВКЛ XV – XVIстст. знаходзіўся на гаспадаскай службе і адначасова лічыўся гаспадарскім слугой. На першы заклік гаспадара ягоны слуга павінен быў з’явіцца на службу, дзе пры неабходнасці трэба было пераджыць нягоды і нават пакласці жыццё [4, с.743]. Вывучэнне кожнай з сфер жыцця шляхецтва будзе садзейнічаць глыбіннаму разуменню зместа, форм і сэнса вайсковасці тагачаснага грамадства Беларусі. На наш погяд дасткова інфарматыўным будзе разгляд «невайсковага»жыцця вышэйшага саслоўя. Тут можна прыгадаць гаспадарчую сферу, адукацыю, падарожжы, культурна-асветніцкую дзейнасць, баўленне вольнага часу (рыцарскія турніры), грамадска-палітычную актыўнасць і інш.

Так, напрыклад, аўтар пахвалы князя Канстанціна Астрожскага удзельніка Оршанскай бітвы 1514 г.,красамоўна апісвае яго «справность военную»[6, с.372]. Астрожкі параўноўаецца з самымі славутымі военачальнікамі старажытнасці і называецца на грэцкі манер стратылатам. Асабліва падкрэсліваюцца арганізатарскія здольнасці і асабістая самаахвярнасць гетмана. Аўтар параўноўвае пераправу войска Асстрожскага праз Дняпро з пераходам македонскага войска праз раку Арсінар. Пры гэтым асабістая мужнасць Канстанціна Астрожскага на полі бою параўноваецца з мужнасцю індыйскага цара Пора [4, с.747].

Вялікакняскае войска называецца «вдатнымі і храбрымі рыцарамі літовскімі і рускімі» [6, с.374]. Рыцарскі чын ВКЛ на Аршанскім полі параўноўваецца з заходнім рыцарствам на востраве Радос, якое змагалася супраць туркаў-асманаў. Астрожкі паказаны як чалавек набажны, бо перад складанай пераправай праз Днепр пад Оршаю, князь накіраваўся ў царкву святой Троіцы і маліўся Мікалаю Цудадзейнаму. Узгадваецца, таксама, што змаганне на полі бою было нетолькі абаронай Айчыны, а і абаронай праваслаўнай царквы. Стваральнік «Пахвалы…» падкрэслівае значнасць перамогі ў гэтай барацьбе не толькі для самага гетмана, а і для дзяржавы ўвогуле. Такая падзея ўмацавала прэстыж каріны ад усходу да захаду і вялікаму князю і каралю Жыгімонту здабыла сусветную славу.

Разглядаючы вайсковую дзейнасць, нельга не спыніцца на паняццях «слава» і «чэсць», якія для тагачаснай вайсковай эліты мелі глыбокі сэнс. Паняцце «чэсць» магло выступаць у некалькіх сэнсах. Можна сустрэць яго ўжыванне як знака пашаны. «Чэсць» мог даравацьсам гаспадар свайму слуге за перамогу ў вайне. Такая «чэсць» магла мець выгляд шыкоўных падарункаў, зямельных надзелаў, высокіх дзяржаўных пасад і інш. Іншы сэнс надаецца «чэсці», калі яе здабываў для свайго гаспадара сам воін. Сваёй ратнай працай і перамогамі над ворагам ваяр праслаўляў імя свайго гаспадара – рабіў яго

вядомым. Часта такая «чэсць» мела і матэрыяльнае выражэнне ў выглядзе ваенных трафеяў, варожых штандартаў, палонных. «Слава», як правіла мела значэнне пахвалы і ўжываўся разам са словам «чэсць».

Час позняга сэрэднявечча быў нялёгкім для нашых продкаў. Змілітарызаванасць тагачаснай палітыкі спрычынілася да стварэння своеасаблівага тыпу ўзброеных сіл і вайсковай дзейнасці. Галоўнай рысай іх было спалучэнне старажытнабеларускіх элементаў вайсковай культуры з эфектыўнымі і перадавымі вынаходніцтвамі Захаду або Усходу. Захоўванне такога спалучэння дазваляе зразумець прычыны фарміравання адметнай вайсковай манеры, якая стала славутай і захоўвалася ў Рэчы Паспалітай аж да яе распаду.

**ЛІТАРАТУРА:**


1. Бохан Ю.М. Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у ІІ палове XIV – XVIст. – Мн.: Беларуская навука, 2008. – 410 с.
2. Бохан Ю.М. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII ст. – Мн.: Беларусь, 2011. – 271 с.
3. Бохан Ю.М. Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель XIV – XVIстст. Мн.: Беларусь, 2012. – 151 с.
4. Канановіч У. «Пахвала князя Канстаціна Астрожскага» як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ апчатку XVI стагоддзя. // Arche, -- 2014. № 12. – С. 736 – 752.
5. Сагановіч Г. Ад Ведрашы да Крапіўны? З ваеннай чыннасці К. Астрожскага // З гісторыяй на «Вы». – Мінск, 1994. – С.166 – 185.
6. Сярэднявечча і раньнемадэрны час / Варонін В. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2013. – 902 с.
7. Электронный ресурс: Любавский М. К. Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государстваhttp://elib.bsu.by/handle/123456789/124. Время доступа: 09.03.2017.